**ПАДРЫХТОЎКА – ГЭТА ДОЎГІ ШЛЯХ, У КАНЦЫ ЯКОГА НЯМА ГАРАНТЫЙ СТАНОЎЧАГА ВЫНІКУ, АЛЕ ЁСЦЬ МЭТА – ПЕРАМАГЧЫ**
Выкладчыкі БДУ пра выхаванне алімпіяднікаў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню Стар. 2

**«РУХАЙСЯ НАПЕРАД, ТАДЫ І АТРЫМАЕШ ВЫНІК»**
Пра пераможцу вераснёўскага Адкрытага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па мастацкай гімнастыцы Дар'ю Ткачову
Стар. 3

**ДЫНАСТЫІ БДУ**
Цыкл матэрыялаў, прысвечаны дынастыям студэнтаў і выкладчыкаў БДУ
Стар. 4-5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

29 кастрычніка 2024 года, № 10 (2288)

# БДУ ПАШЫРЫЎ МІЖНАРОДНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ Ў РАМКАХ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ СЕТКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА







Гэта пытанне стала прыярытэтным падчас афіцыйнага візіту ў Кітай дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём. У якасці аднаго з суарганізатараў сеткі ён прыняў удзел у пасяджэнні другога з'езда iUNRC (г. Чунцын, Кітай).

Прабламатыка ўключала падвядзенне вынікаў дзейнасці iUNRC, прыняцце новых членаў, выбары кіраўнікоў працоўных груп па тэматычных напрамках. На дадзены момант у рамках сеткі вызначаны прыярытэтныя вектары міжуніверсітэцкага ўзаемадзеяння. У іх лік уваходзяць галіна вялікіх даных для ўстойлівага развіцця; адказнае спажыванне і вытворчасць; прамысловасць, інавацыі і інфраструктура; змена клімату; лічбавая трансфармацыя адукацыі; сельская гаспадарка; ахова здароўя і дабрабыт; ліквідацыя наступстваў стыхійных бедстваў і антыкрызіснае кіраванне; устойлівая, адказная і экалагічная здабыча мінеральных рэсурсаў; гуманітарныя і сацыяльныя навукі; спадчына, гісторыя і ўстойлівае развіццё тэрыторый. БДУ прадставіў звыш 40 прапаноў навуковага супрацоўніцтва па назначаных напрамках, кандыдатуры для ўдзелу ў працоўных групах і праграме таленавітых маладых навукоўцаў 2024 года. Дадзеная праграма прадугледжвае праходжанне навуковых стажыровак у кітайскіх навукова-даследчых інстытутах, універсітэтах і на прадпрыемствах.

Адной са знакавых падзей другога з'езда Савета iUNRC стаў форум рэктараў «Універсітэты і ўстойлівае развіццё» ініцыятывы «Адзін пояс – адзін шлях». Тут Андрэй Кароль выступіў з дакладам «Пра ролю БДУ ў сучасным шматпалярным свеце: традыцыі і інавацыі». Са слоў рэктара, сёння ВНУ рэагуе на ўсе запыты часу, дэманструючы высокі ўзровень адукацыі, навукова-інавацыйны і партнёрскі патэнцыял. У Беларусі БДУ з'яўляецца лідарам па падрыхтоўцы замежных студэнтаў, паводле міжнародных рэйтынгаў уваходзіць у 1% наймацнейшых ВНУ, актыўна развівае міжнароднае супрацоўніцтва, дзе Кітай у ліку прыярытэтных стратэгічных партнёраў. У наш час дзейнічае больш за 100 дамоў з універсітэтамі і арганізацыямі гэтай краіны. Актыўна развіваецца супрацоўніцтва з Пекінскім універсітэтам (ПКУ), Далянскім політэхнічным універсітэтам, Універсітэтам Цінхуа і іншымі. Заснаваныя ў гэтым годзе «Дні сяброўства і адзінства ПКУ і БДУ», на думку рэктара беларускай ВНУ, паказваюць высокі ўзровень міжуніверсітэцкіх узаемаадносін і адкрываюць новыя магчымасці для іх прадметнага напаўнення. У наш час ёсць рашэнні з Пекінскім універсітэтам пра стварэнне Кітайска-беларускага цэнтра фундаментальных навуковых даследаванняў.

Найважнейшым напрамкам, са слоў рэктара БДУ, з'яўляецца павышэнне якасці адукацыі. Міждысцыплінарны падыход, новыя спецыяльнасці, сучасныя метады навучання, унікальныя навучальныя праграмы і дысцыпліны дазваляюць рэалізаваць гэту задачу і максімальна ўцягваць студэнтаў у працэс навучання. У БДУ рэалізуюцца сумесныя праграмы бакалаўрыята і магістратуры па 20 напрамках з ВНУ Расіі, Кітая, Таджыкістана і Узбекістана.

## ДАВЕДКА

Універсітэцкая сетка навукова-даследчага супрацоўніцтва (iUNRC, Кітай) заснавана ў 2023 годзе. Ініцыятарам яе стварэння сталі Міністэрства навукі і тэхналогій, Кітайская акадэмія навук, Кітайская інжынерная акадэмія, Кітайская асацыяцыя навукі і тэхналогій, правінцыя Сычуань і муніцыпалітэт горада Чунцын. Адным з заснавальнікаў сеткі стаў БДУ, што пацвярджае значнасць ВНУ ва ўмацаванні беларуска-кітайскіх адносін у галіне адукацыі і навукі.

Адкрыццё iUNRC адбылося ў г. Чунцын у рамках І Міжнароднага кангрэса па навукова-тэхнічных абменах «Адзін пояс – адзін шлях».

Удзельнікамі падпісання ўстановачнага дакумента сталі кіраўнікі ВНУ 12 краін: Беларусі, Кітая, Аргенціны, Брунея, Малайзіі, Марока, Малдовы, Манголіі, Узбекістана, Чарнагорыі, Эфіопіі і ПАР.

**Працягнуўся візіт у Кітай заключэннем дзвюх новых дамоў.** У прыватнасці, беларускі бок падпісаў з Чунцынскім універсітэтам мемарандум аб паразуменні, які прадугледжвае акадэмічны абмен студэнтамі, выкладчыкамі, рэалізацыю сумесных адукацыйных, навукова-даследчых праграм і праектаў, абмен інфармацыяй, навучальнымі матэрыяламі і навуковымі справаздачамі, арганізацыю канферэнцый, семінараў, практыкумаў, курсаў, падрыхтоўку калектыўных публікацый.

Падчас сустрэчы бакі дэталёва разгледзелі формы міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва, прадметнае напаўненне падпісанага дакумента праз рэалізацыю навукова-тэхнічных і інавацыйных праектаў, моладзевых ініцыятыў, узаемны ўдзел студэнтаў у летніх і зімовых школах.

Таксама падпісаны мемарандум аб паразуменні з Чунцынскім інстытутам замежнага бізнесу і эканомікі. Дадзены дакумент рэгламентуе намеры бакоў развіваць адукацыйна-навуковае партнёрства і распрацоўку сумесных праграм па падрыхтоўцы кітайскіх грамадзян. Сёння кітайскі інстытут арыентаваны на навучанне спецыялістаў у галіне міжнароднага бізнесу; вялікіх даных і інтэлектуальнай інжынерыі; замежных моў і міжнароднага гандлю; літаратуры і творчасці; менеджменту; матэматыкі і інфарматыкі; мастацтваў і дызайну; тэлебачання і інтэграваных медыя і інш. Прадугледжваецца, што абмен досведам у дадзеных сферах дазволіць ВНУ выкарыстоўваць сучасныя падыходы і праграмы ў падрыхтоўцы студэнтаў.

**Таксама адбылася сустрэча беларускага боку з кіраўніцтвам універсітэта Цындаа,** на якой дэталёва прапрацоўвалася тэма пашырэння дзейнасці сумеснага Даследчага цэнтра ШАС, адкрытага на базе ФМА БДУ ў 2023 годзе.

Бакі падвялі вынікі гадавой працы структуры, узгаднілі прыярытэтныя напрамкі развіцця і план працы цэнтра на 2024/2025 навучальны год. Вынікам праведзеных перамоў сталі дамоўленасці пра падрыхтоўку і выданне сумесных публікацый і навучальных дапаможнікаў па выніках даследаванняў у галіне міжнароднай дзейнасці, гісторыі, права, гандлю, эканомікі і культуры ШАС.

Дарэчы, з Універсітэтам Цындаа БДУ супрацоўнічае ў рамках трох дамоў.

Працягнуўся візіт у Цындааскі партовы прафесійна-тэхнічны інстытут. Тут прайшла сустрэча з кіраўніцтвам, выкладчыкамі і студэнтамі. Іх пазнаёмілі са структурай, спецыяльнасцямі БДУ, распавялі пра перавагі навучання ў беларускай ВНУ і асаблівасці адукацыйнага працэсу з улікам выкарыстання інавацыйных методык. Бакі таксама разгледзелі напаўненне новымі формамі ўзаемадзеяння мемарандум аб паразуменні ад 2023 года, дэталёва абмеркавалі рэалізацыю дакумента, магчымасць узаемнага ўдзелу ў падрыхтоўцы студэнтаў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 кастрычніка 2024 года, № 10 (2288)

# ПАДРЫХТОЎКА – ГЭТА ДОЎГІ ШЛЯХ, У КАНЦЫ ЯКОГА НЯМА ГАРАНТЫЙ СТАНОЎЧАГА ВЫНІКУ, АЛЕ ЁСЦЬ МЭТА – ПЕРАМАГЧЫ

*Выкладчыкі ФГіГ БДУ пра выхаванне алімпіяднікаў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню*

**За лета беларускія школьнікі наведалі дзве геалагічныя і тры міжнародныя геаграфічныя алімпіяды, дзе паказалі найвышэйшыя вынікі за ўсю гісторыю ўдзелу беларускіх зборных. Кіраўнікамі каманд традыцыйна выступілі выкладчыкі факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ. Пра тое, як сёння падрыхтаваць паспяховага алімпіядніка, пагутарылі з першым прарэктарам Дзмітрыем Курловічам, дэканам ФГіГ Аленай Кальмаковай і намеснікам дэкана па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях Наталляй Пісарчук.**



## «У ЗВЯЗЦЫ "ШКОЛА – УВА" АДБЫВАЕЦЦА АДБОР ТАЛЕНАВІТЫХ ДЗЯЦЕЙ»

Суразмоўцы прызнаюцца, што пытанне, колькі патрэбна часу, каб падрыхтаваць алімпіядніка высокага ўзроўню, не мае адназначнага адказу. Але практыка паказвае, што да міжнародных спаборніцтваў лепей гатовыя дзеці, якія знаходзяцца ў алімпіядным руху не адзін год. Па словах Алены Генадзьеўны і Наталлі Міхайлаўны, такія навучэнцы цікавяцца геаграфіяй з малодшага школьнага ўзросту. Але падрыхтоўка – гэта заўсёды доўгі шлях, у канцы якога няма гарантый станоўчага выніку, хоць і ёсць мэта – перамагчы.

– Зацікаўленасць дзіцяці геаграфіяй распазнаецца ў школе. Педагог бачыць, што некаторым вучням прадмет даецца лягчэй, у іх гараць вочы, яны прасцей выбудоўваюць прычынна-выніковыя сувязі. І самае галоўнае – заўважае ўнутраную матывацыю да атрымання такіх ведаў. Тады настаўнік пачынае займацца са школьнікамі, заяўляе іх на выступленні – раённыя, гарадскія, абласныя. На гэтым этапе факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі праводзіць зборы для ўдзельнікаў «вобласці» і «рэспублікі». І ў працэсе шматступеньчатай падрыхтоўкі ў звязцы «школа – УВА" адбываецца адбор найбольш таленавітых дзяцей для рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, – заўважаюць Алена Кальмакова і Наталля Пісарчук.

## ФАКУЛЬТЭТ, ЯКІ ДАЕ МАГЧЫМАСЦІ

Шмат дзесяцігоддзяў выкладчыкі ФГіГ уваходзяць у склад журы абласнога і рэспубліканскага этапаў алімпіяды па геаграфіі, становяцца арганізатарамі прадметных збораў. Яны ж праводзяць тэсціраванне школьнікаў, на аснове якога фарміруецца асноўны і запасны склад зборнай Беларусі, а пасля працуюць з ёй. Як расказваюць дэкан і намеснік дэкана, зборы працягваюцца 10-14 дзён з 9 да 17 гадзін. Рыхтуюць хлопцаў і дзяўчат спецыялісты па розных напрамках – экалогіі, дэмаграфіі, геалогіі, устойлівым развіцці і інш. Палову дня школьнікі адточваюць англійскую мову, другую – займаюцца вузкімі кірункамі алімпіяды. Самае цяжкае ў працэсе падрыхтоўкі, як адзначаюць суразмоўцы, немагчымасць угадаць, з якой галіны геаграфіі трапяцца заданні. Таму выкладчыкі стараюцца давесці да дзяцей новыя трэнды. І ў цэлым вучэбны час выбудоўваецца так, каб тэматыка была падобная, а тэмы – розныя: так удзельнікі мінулых гадоў не слухаюць матэрыял двойчы, аназапашваюць новыя веды. Трэніроўка школьнікаў, як прызнаюцца выкладчыкі, працэс працаёмкі і энергазатратны: інфармацыю да заняткаў патрэбна збіраць па крупінках у базах даных, статыстычных звестках і на сайтах міжнародных арганізацый. Для таго, каб аднойчы прыйсці ў аўдыторыю, патрэбна рыхтавацца некалькі дзён. Але нагрузка акупаецца зацікаўленасцю юнакоў і дзяўчат: матываваныя школьнікі адчуваюць адносіны выкладчыкаў і ўключаюцца ў працэс – шукаюць інфармацыю дадаткова, чытаюць навуковыя артыкулы.

Акрамя таго, педагагічны калектыў факультэта з'яўляецца распрацоўшчыкам заданняў для 3 і 4 этапаў прадметнай алімпіяды. І, па словах дэкана Алены Кальмаковай, такая пераемнасць дае свой плён, паколькі фарміруе алімпіядны дух, дазваляе рабіць заданні ў адпаведнасці з павевамі часу і міжнароднымі стандартамі. Як правіла, алімпіяды такога ўзроўню ўключаюць у сябе шмат інфармацыі па іншых галінах. Сёлета, напрыклад, на Міжнароднай алімпіядзе па навуках пра Зямлю былі заданні па астраноміі, акеаналогіі, фізіцы, геафізіцы, геахіміі, геалогіі і метэаралогіі. Падобныя веды, як водзіцца, не толькі немагчыма знайсці ў школьных падручніках, але нават у праграме УВА можна прачытаць не заўсёды. Да таго ж, заданні для ўдзельнікаў з англійскай мовы звычайна не перакладаюцца. Таму міжнародныя старты, як падкрэсліваюць Алена Генадзьеўна і Наталля Міхайлаўна, – пляцоўкі для інтэлектуалаў, якія не баяцца сустрэцца з новай інфармацыяй і могуць шукаць спосабы рашэння праблем у нестандартных сітуацыях.

– Практычны тур на мясцовасці – самая складаная і непрадказальная частка. Доўгія гады нашы дзеці саступалі ў ёй, што было звязана з мінімальнай колькасцю гадзін вывучэння геаграфіі ў школах. Згадзіцеся, складана спаборнічаць з удзельнікамі, якія вывучаюць прадмет да 6 гадзін на тыдзень, а ў нас гадзіну-паўтары. Але апошнім часам сітуацыя перамалілася, і балы нашых удзельнікаў на гэтым туры стабільна ідуць уверх, – тлумачыць Алена Генадзьеўна. – З наступнага года мы плануем зрабіць зборы ў два этапы – тэарэтычны і практычны. Апошні, спадзяёмся, будзе адбывацца на базе нашай геаграфічнай станцыі «Заходняя Бярэзіна». На мясцовасці навучэнцы змогуць авалодаць навыкамі геабатанікі, ландшафтазнаўства, геамарфалогіі, метэаралогіі, глебазнаўства, яшчэ больш узмоцняць сваю «практыку». Ва ўсёй краіне толькі ў нашага ўніверсітэта ёсць магчымасці для падрыхтоўкі такога ўзроўню.

## КІРАЎНІК, ШТО НАСТРОІЦЬ НА ПРАЦУ

Некаторыя выкладчыкі геафака становяцца кіраўнікамі каманд на спаборніцтвах за мяжой. Мала хто задумваецца, але задачы гэтых людзей на алімпіядах не абмяжоўваюцца толькі суправаджэннем дзяцей. Педагогі дапамагаюць сваім гадаванцам актуалізаваць атрыманыя раней веды, акцэнтуюць увагу на інфармацыі, якая прыходзіць звонку, і скіроўваюць у інтэрпрэтацыі сабраных звестак. Напрыклад, на сёлетняй Еўрапейскай геаграфічнай алімпіядзе (EGEO – 2024), што праходзіла ў гарах сербскага Нацыянальнага парка Капаонік, выкладчыкі адразу ж спрагназавалі: заданні будуць звязаны з мясцовасцю. На гэтым этапе кіраўнікі стараліся зарыентаваць дзяцей на магчымыя напрамкі заданняў практычнага тура: разам з імі вывучылі ландшафт і інфраструктуру, знайшлі экалагічныя праблемы, абмеркавалі. Аказалася, што найбольш актуальным пытаннем для мясцін стала высокая шчыльнасць наведвальнікаў, абумоўленая вялікай турыстычнай плынню. У выніку чаканні педагогаў спраўдзіліся.

Таксама кіраўнікі каманды адказваюць за забеспячэнне ў ёй псіхалагічнага камфорту. На сур'ёзных спаборніцтвах школьнікі адчуваюць сябе па-рознаму: камусьці неабходна больш эмацыйнай падтрымкі, іншаму, наадварот, крыху аддаліцца. Задача выкладчыкаў у гэтым выпадку – улічыць асаблівасці дзяцей і правільна настроіць на працу.

– Што можа перашкодзіць годна выступіць на высокім ўзроўні, дык гэта найперш усведамленне адказнасці, якое адчуваюць школьнікі. За імі заўсёды стаяць іх педагогі, бацькі, школа, якія спадзяюцца на добры вынік. Гэта цісне, таму трэнер каманды працуе з такімі адчуваннямі, – кажа Наталля Міхайлаўна.

## ВЫСІЛКІ МІНУЛАГА СТВАРАЮЦЬ БУДУЧЫНЮ

Алімпіяднікі, многія з якіх становяцца студэнтамі ФГіГ, не растрачваюць свой патэнцыял пасля паступлення. Яны і далей удзельнічаюць у міжнародных спаборніцтвах і канферэнцыях, маюць большую публікацыйную актыўнасць у параўнанні са сваімі аднагодкамі, уключаюцца ў банк адоранай моладзі і ўдзельнічаюць у конкурсах на гранты. Гэтыя навучэнцы вылучаюцца на агульным фоне сваёй дапытлівасцю і працаздольнасцю. А на факультэце стараюцца, каб яны не разгубілі сваю іскру. Вось і сёлета студэнтамі ФГіГ сталі чацвёра былых алімпіяднікаў: Станіслаў Брадніцкі (спецыяльнасць «геалогія»), Аляксандра Багданава («краіназнаўства і перакладчыцкая дзейнасць»), Вадзім Ігнаценка («геаінфармацыйныя сістэмы») і Ягор Сушкоў («космааэраграфія і геадэзія»).

– Штогод да нас паступаюць ад 8 да 16 удзельнікаў апошняга этапу рэспубліканскай алімпіяды ці міжнародных стартаў. Сёлета па дасягненнях мы паказалі самыя лепшыя вынікі. Спрагназаваць гэта было немагчыма, але такі вынік сведчыць пра пераход ад колькасных да якасных змен. Шматгадовыя высілкі вялікай колькасці людзей нарэшце прынеслі плён, – рэзюмуюць Алена Генадзьеўна і Наталля Міхайлаўна. – Для поспеху заўсёды патрэбныя агульныя намаганні: асабістая матывацыя школьніка, таленавіты выкладчык і падтрымка школы. Толькі ў сукупнасці складнікаў можна спадзявацца на перамогу.

## ДАВЕДКА

**Узнагароды з летніх алімпіяд у лічбах:**

XX Міжнародная геаграфічная алімпіяда (iGeo – 2024, Ірландыя) – два сярэбраныя і два бронзавыя медалі (упершыню ў гісторыі беларуская каманда прывезла з гэтым спаборніцтваў чатыры ўзнагароды);

VII Міжнародная алімпіяда па навуках пра Зямлю (IESO, КНР) – тры залатыя, адзін сярэбраны і два бронзавыя медалі (найлепшы вынік нашай зборнай);

10-я Еўрапейская геаграфічная алімпіяда (EGEO – 2024, Сербія) – тры залатыя, сярэбраны і бронзавы медалі (у тым ліку абсалютная перамога Мікалая Місіюка).

**Першы прарэктар БДУ Дзмітрый Курловіч:**



– Лічу, што зараз алімпіядны рух у нашай краіне выходзіць на новы ўзровень. Ён дазваляе знаходзіць высокаматываваных школьнікаў, суправаджаць іх на этапе падрыхтоўкі і прапаноўваць ім траекторыі прафесійнага станаўлення, каб у будучыні атрымаць спецыяліста сусветнага ўзроўню.

Калі мы прыязджаем на такую вялікую пляцоўку, як Міжнародная алімпіяда па навуках пра Зямлю, дзе сярод таленавітых школьнікаў з усяго свету ўзнагародамі адзначаюцца беларусы, гэта акрыляе. Ты ганарышся сваёй краінай і тым, што нашы дзеці паказваюць вынікі міжнароднага ўзроўню. Хацелася б таксама адзначыць і Міжнародную геаграфічную алімпіяду – свайго роду Алімпійскія гульні па прадмеце. Мне запомнілася, як у 2021 годзе старшакласнік Дзяніс Рабчук другі раз у гісторыі нацыянальнай зборнай заваяваў залаты медаль. І як праз год каманда паўтарыла яго вынік. Усё гэта вельмі эмацыйныя падзеі.

**Ірына ІВАШКА**

# СТВАРАЕМ БУДУЧЫНЮ РАЗАМ



У БДУ адбыўся Форум студэнцкіх ініцыятыў. Ён накіраваны на дапамогу студэнтам з адаптацыяй ва ўніверсітэце, стварэнне ўмоў для рэалізацыі іх патэнцыялу і знаёмства са студэнцкімі арганізацыямі. У гэтым мерапрыемстве паўдзельнічалі больш за 140 першакурснікаў, якія прапанавалі свае самыя смелыя ідэі.

Праграма форуму ўключала тэарэтычную і практычную часткі. У першы дзень студэнты пазнаёміліся і падзяліліся на каманды па жаданых кірунках.

Пазней для іх прайшлі трэнінгі па фарміраванні крэатыўных навыкаў, кіраванні праектамі, аратарскім майстэрстве і іншых напрамках. Студэнты наведалі некалькі воркшопаў, кожны з якіх быў прысвечаны розным аспектам праектнай працы. На майстар-класах удзельнікі форуму вырашалі практычныя кейсы, якія пасля маглі прымяніць у сваіх распрацоўках. Ім расказвалі пра менеджмент праектаў, правілы падачы сваіх ідэй экспертам і іншыя сакрэты, якія можна было выкарыстоўваць ужо падчас форуму.



Асабліва запамінальным для студэнтаў стаў воркшоп пра крэатыўнасць ад старшага выкладчыка эканамічнага факультэта Уладзіслава Макарэвіча. На ім удзельнікі вывучалі розныя тэхнікі генерацыі ідэй, нестандартнае мысленне, на практыцы аналізавалі падыход людзей да розных творчых праектаў.

Таксама першакурснікі адзначылі майстар-клас «Soft skills» выпускніцы юрфака Стэфаніі-Віталіі Вінічак. Студэнты даведаліся, як эфектыўна структураваць і прадстаўляць інфармацыю, каб прыцягнуць да сябе і сваіх ідэй увагу.

У наступны дзень першакурснікам сумесна з куратарамі трэба было распрацаваць праекты з улікам спецыфікі прадстаўленых раней студэнцкіх арганізацый. Ініцыятывы павінны былі змяшчаць вырашэнне пытанняў у галіне адукацыі, моладзевай навукі, сацыяльнай падтрымкі, грамадзянска-патрыятычнага выхавання, узаемадзеяння з замежнымі студэнтамі і інш.

Вынікам інтэнсіву стала абарона праектаў. Ацэньвалі прапановы першакурснікаў журы ў складзе супрацоўнікаў упраўлення па выхаваўчай рабоце з моладдзю і лідараў студэнцкіх арганізацый.

Найлепшай распрацоўкай выбралі «Студгенкам – Студэнцкае генераванне ідэй». Ініцыятыва прадстаўляе інтэрнэт-платформу. Па задумцы ўдзельнікаў, ён можа быць рэалізаваны як сайт ці форум, на якім студэнты могуць дзяліцца сваімі ідэямі для мерапрыемстваў і запрашаць зацікаўленых на іншыя актыўнасці.

*– Сутнасць праекта ў тым, каб усе студэнты былі пачутыя, незалежна ад таго, ёсць яны ў нейкіх арганізацыях ці не, – сказалі падчас прэзентацыі першакурснікі.*

Яны прызнаюцца, што праект не атрымаўся б такім суцэльным без добрага калектыву. Фарміраванне каманды прайшло праз некалькі этапаў. Першапачатковая група была даволі вялікай, цікавасць праявіла больш за 30 удзельнікаў.

*– У выніку распрацоўваць «Студгенкам» засталіся 14 самых матэнакіраваных, якія сапраўды зацікавіліся праектам і былі гатовы ўкласці свой час і намаганні. Яны паказалі сапраўдны энтузіязм і жаданне працаваць над пастаўленай задачай, – распавядае куратар каманды пераможцаў Алеся Бар'яша.*

Яна расказала, што ідэя праекта прыйшла не адразу. Яны разважалі над рознымі праблемамі, з якімі сутыкаюцца студэнты і супрацоўнікі ўніверсітэта. У нейкі момант адзін з удзельнікаў каманды ўзняў цікавае пытанне: як студэнты, якія не патрапілі на форум ці іншыя падобныя мерапрыемствы, могуць прапанаваць свае ідэі? Гэта зачапіла ўсіх, і падчас доўгіх абмеркаванняў каманда ўсвядоміла, што існуе прабел у камунікацыі паміж студэнтамі з інавацыйнымі ідэямі і арганізацыямі, здольнымі гэтыя ідэі рэалізаваць. Яны зразумелі, што не хапае прамога і эфектыўнага спосабу для студэнтаў данесці свае ідэі да тых, хто можа іх увасобіць у жыццё.

*– Гэта думка выклікала ў нас бурнае абмеркаванне. Мы пачалі разважаць, як можна стварыць кароткі шлях для ідэй, які б дазволіў студэнтам праяўляць сябе і дзяліцца сваімі ініцыятывамі, а арганізацыям не разважаць над мерапрыемствамі і над тым, што можа спадабацца студэнтам. Пасля працяглага «мазгавога штурму» мы прыйшлі да канцэпцыі нашага бягучага праекта. Мы распрацавалі ідэю платформы, якая магла б служыць гэтым кароткім шляхам для студэнцкіх ініцыятыў, – дадае Алеся.*

Другое месца прысудзілі праекту міжнароднай накіраванасці «Даведнік па Новым Міры», выстаўленаму ад імя савета зямляцтваў і саюза інтэрнатаў студгарадка. Гэта дадатак, арыентаваны на дапамогу ў адаптацыі замежным студэнтам да вучобы ў БДУ, да новых умоў жыцця, на знаёмства з культурай і знакавымі месцамі Беларусі. Ён дазволіць шукаць неабходную інфармацыю пра маршруты і транспарт, лакацыі і інструкцыі.

*– Мы паставілі перад сабой задачы: інфармаваць замежных грамадзян пра структуру стударганізацый і іх дзейнасць, аблегчыць успрыманне інфармацыі пасродкам перакладу на родную мову, а таксама спрасціць працэс засялення ў інтэрнат, – расказвалі ўдзельнікі на абароне праекта.*

На трэцім месцы праект навукова-адукацыйнага напрамку «Дадатак аб турыстычным патэнцыяле Рэспублікі Беларусь». Студэнты прапанавалі скласці карту з гістарычнымі, экалагічнымі, культурнымі славутасцямі нашай краіны.

Перад удзельнікамі стаяла задача прэзентаваць сваю распрацоўку за шэсць хвілін і адказаць на пытанні экспертаў. Пры гэтым журы ацэньвала змест, актуальнасць работ, перспектывы рэалізацыі на базе ўніверсітэта, прэзентацыю і крэатыў.

Першакурснікі адзначаюць карысць Форуму студэнцкіх ініцыятыў. Апрача знаёмства з дзейнасцю органаў студэнцкага самакіравання і ўніверсітэта ў цэлым, ён паказаў, што ў БДУ жадаюць пачуць ідэі будучых спецыялістаў і могуць дапамагчы рэалізаваць свой патэнцыял.

*– Стварэнне праектаў будзе суправаджаць студэнтаў на працягу ўсёй вучобы ва ўніверсітэце, – адзначыў начальнік упраўлення па выхаваўчай рабоце з моладдзю Аляксей Шавель. – Гэта неацэнны вопыт, і, магчыма, нехта на аснове такой дзейнасці знойдзе сваю будучыню.*

**Ганна КАЗАКОВА**

# НА ДОБРУЮ СПРАВУ: ДНІ ДОНАРА Ў БДУ

*У БДУ прайшлі Дні донара: 11 і 12 кастрычніка спецыялісты РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій прымалі кроў у студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.*

Для тых, каму ўжо даводзілася быць донарам крыві, працэдуры, якія праходзілі на механіка-матэматычным факультэце, будуць добра знаёмымі. Спачатку праверка медыцынскіх дакументаў, потым агляд урача-тэрапеўта, атрыманне абавязковага пайка і толькі пасля гэтага здача крыві. Але тым, хто прыйшоў упершыню, усё гэта было ў навінку. Яны з нецярпеннем чакалі сваёй чаргі, каб самім пераканацца ў зручнасці і бяспецы працэсу. Такім быў вопыт Яны Кацько, трэцякурсніцы юрыдычнага факультэта.

– Прыехала з цвёрдым намерам дапамагчы людзям, бо патрэба ў донарскай крыві заўсёды вялікая. Хоць для мяне было нязвыкла, але не надта хваляваласся: ведала, што ўсё пройдзе добра. Так і здарылася! Уражанні засталіся вельмі пазітыўныя, таму абавязкова прыйду яшчэ.

Разам з ёй у калідоры размясціліся іншыя донары: студэнты і супрацоўнікі БДУ, навічкі і вопытныя ў гэтай справе. Атмасфера была ажыўленая. Адны пераправяралі інфармацыю ў запоўненых анкетах, іншыя абмяркоўвалі навучальныя і не толькі справы, а хтосьці проста адпачываў, аднаўляючы сілы пасля донарства. За парадкам сачылі валанцёры розных факультэтаў, якія таксама дапамагалі з транспарціроўкай абсталявання РНПЦ і маглі аказаць неадкладную дапамогу донарам у выпадку пагаршэння іх самаадчування. «Праца адказная, але важная: у медыкаў і так поўна клопатаў», – так валанцёры адказалі на пытанне пра матывацыю. А адзін з іх дадаў:

– Мне прыемна ад усведамлення таго, што магу камусьці працягнуць руку для дапамогі. Акрамя таго, Дні донара – выдатная магчымасць пазнаёміцца з новымі людзьмі і даведацца пра цікавыя арганізацыйныя тонкасці. Для мяне ўжо адно гэта з'яўляецца дастатковай узнагародай.

Плынь ахвотнікаў здаць кроў заставалася стабільна вялікай на працягу ўсёй акцыі. Толькі за другі дзень прыйшло больш за сто чалавек. Шмат у чым гэта заслуга асветніцкай працы, якая праводзіцца адміністрацыяй механіка-матэматычнага факультэта і ўніверсітэта ў цэлым. Напярэдадні восеньскіх Дзён донара студэнты і супрацоўнікі мехмата маглі праслухаць лекцыю «Донар крыві – выратавальнік жыцця!» ад супрацоўнікаў РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій. Акрамя таго, намеснік дэкана механіка-матэматычнага факультэта па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце Аксана Карневіч далучылася да астатніх донараў і без складанасцяў прайшла працэдуру донарства. Аксана Мікалаеўна, як і многія іншыя, донарам стала ўпершыню.



– Я хацела паказаць прыклад студэнтам, пераканаць іх у тым, што баяцца няма чаго. Хоць сама крыху перажывала, што магу страціць прытомнасць. А падчас самога працэсу нават здзівілася, наколькі лёгка ўсё праходзіць. Усё арганізавана на самым лепшым узроўні, ніякіх заўваг не ўзнікла. Адчуваю сябе выдатна.

Акцыя «Дні донара» з'яўляецца штогадовай. Калі не паспелі ў гэты раз, сачыце за сайтам і сацыяльнымі сеткамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, каб не прапусціць анонс наступнай акцыі.

**Дзям'ян КУЛІКОВІЧ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 кастрычніка 2024 года, № 10 (2288)

# ДЫНАСТЫЯ КРУГЛОВЫХ: 116 ГАДОЎ З БДУ

**Музей гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта захоўвае памяць не толькі пра важныя падзеі з жыцця alma mater, але і пра людзей, якія тут вучацца і працуюць. Дадзены матэрыял стане пачаткам цыкла, прысвечанага дынастыям студэнтаў і выкладчыкаў БДУ.**

Дынастыю Кругловых складаюць дактары навук, прафесары, загадчык кафедры, кандыдаты навук, аўтары навуковых прац, падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. Педагагічны стаж дынастыі Кругловых у БДУ складае 116 гадоў.



**Круглоў Анатоль Агапеевіч** – доктар філасофскіх навук, прафесар. Педагагічны стаж у БДУ – 48 гадоў. Нарадзіўся 4 сакавіка 1932 г. у в. Курганава Смаленскай вобласці. Жонка – Круглова Паліна Дзянісаўна. Свой працоўны шлях Анатоль Агапеевіч пачаў старшым піянерважатым яшчэ ў Віцебскім дзіцячым доме №6 з дапаможнай школай у 1949 годзе. Скончыўшы філалагічны факультэт БДУ (1958), працаваў завучам Старасельскай СШ на Віцебшчыне. У 1965 годзе паступіў у аспірантуру БДУ, а з 1968 года пачаў працаваць у БДУ. Узначальваў кафедру этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму БДУ, працаваў прафесарам кафедры філасофіі культуры ФФСН БДУ (працоўны стаж амаль 67 гадоў, з іх 48 гадоў у БДУ). Шмат гадоў працаваў у інтэрнацыянальным спартыўным лагеры БДУ на возеры Нарач.

Узнагароджаны медалём «Ветэран працы». Ганараваны звання «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь». Член-карэспандэнт Акадэміі адукацыі Рэспублікі Беларусь. Заслужаны работнік БДУ. Узнагароджаны нагрудным знакам «100 гадоў БДУ».

За актыўную і шматгадовую працу ў таварыстве «Веды» ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі ЦК КПСС, ЦК ВЛКСМ, ЦК КПБ, Мінаблвыканкама, Мінгарвыканкама. За выбітны ўнёсак у прапаганду навуковых ведаў узнагароджаны Усесаюзным таварыствам «Веды» «Настольным медалём Вавілава».

На працягу больш чым 30 гадоў з'яўляўся старшынёй дзяржаўнага рэлігіязнаўчага экспертнага савета пры ўпаўнаважаным па справах рэлігіі і нацыянальнасцяў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Аўтар звыш 500 навуковых прац, у тым ліку больш чым 20 падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. Сярод іх манаграфіі «Мы і рэлігія», «Свабода сумлення», «Развіццё атэізму ў Беларусі», падручнікі і навучальныя дапаможнікі «Асновы навуковага атэізму», «Гісторыя і тэорыя рэлігіі і вальнадумства», «Асновы рэлігіязнаўства», «Гісторыя рэлігій». Падрыхтаваў 4 кандыдатаў філасофскіх навук.



**Круглова Галіна Анатольеўна** – прафесар кафедры паліталогіі БДУ (дачка Круглова А. А. і Кругловай П. Д.). Педагагічны стаж у БДУ – 42 гады.

Круглова Галіна Анатольеўна нарадзілася 03.06.1960 у в. Запруддзе Віцебскай вобласці.

У 1982 г. з адзнакай скончыла філасофскае аддзяленне БДУ. У лістападзе 1982 года была залічана на пасаду стажора-выкладчыка кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі БДУ.

З лістапада 1986 г. працуе на кафедры паліталогіі юрыдычнага факультэта. У 1987 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. У 1991 г. прысвоена званне дацэнта.

У 2008 г. абараніла доктарскую дысертацыю ў Ленінградскім дзяржаўным універсітэце. У 2009 г. прысуджана навуковая ступень доктара філасофскіх навук РФ.

У верасні 2015 г. пастановай прэзідыума ВАК Рэспублікі Беларусь на аснове настрыфікацыі прысуджана ступень доктара філасофскіх навук Рэспублікі Беларусь.

З лістапада 2016 г. па цяперашні час працуе на пасадзе прафесара кафедры паліталогіі БДУ.

Аўтар больш чым 170 навуковых прац, у тым ліку 6 аднаасобных манаграфій, 14 навучальных і навучальна-метадычных дапаможнікаў. Пры гэтым навучальны дапаможнік «Паліталогія» (1994) быў выдадзены адным з першых у нашай краіне. Больш за 40 навуковых артыкулаў апублікавана за мяжой, у тым ліку і на замежных мовах.

Ветэран працы. Ганаровая грамата БДУ (2010, 2015), ганаровае званне «Заслужаны работнік БДУ» (2019), падзяка рэктара БДУ (2020); ганаровая грамата ад Апарату ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь (2020), нагрудны знак «100 гадоў БДУ» (2023).



**Буко Валянцін Пятровіч** – старшы выкладчык кафедры нямецкай мовы факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ (муж Кругловай Г. А., зяць Круглова А. А. і Кругловай П. Д.). Педагагічны стаж у БДУ – 21 год.

Буко Валянцін Пятровіч нарадзіўся 27.01.1964 у в. Лозічы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

У 1986 годзе з адзнакай скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (спецыяльнасць «гісторыя і нямецкая мова»).

З верасня 1986 г. па чэрвень 1989 г. працаваў настаўнікам Бярэзінскай і Тумілавіцкай сярэдніх школ Докшыцкага раёна. З верасня 1989 г. па снежань 1991 г. працаваў настаўнікам у вёсцы Мосар Глыбоцкага раёна. Ад снежня 1991 г. да чэрвеня 1993 г. – у вёсцы Тарасава Мінскага раёна. З верасня 1993 года і па цяперашні час працуе старшым выкладчыкам кафедры нямецкай мовы факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ.

Мае больш за 50 навуковых публікацый, у тым ліку і за мяжой.

Падзяка БДУ (2014), падзяка гуманітарнага факультэта БДУ (2014), нагрудны знак «100 гадоў БДУ» (2021), ганаровае званне «Заслужаны работнік БДУ» (2022), грамата БДУ (2024).



**Круглова Вольга Валянцінаўна** – дацэнт кафедры германскіх моў ФМА БДУ (дачка Кругловай Г. А. і Буко В. П.). Педагагічны стаж у БДУ – 5 гадоў.

Круглова Вольга Валянцінаўна нарадзілася 23.11.1992 года ў Мінску.

У 2015 г. з адзнакай скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «славянская (польская і беларуская) філалогія».

У 2016 г. атрымала ступень магістра філалагічных навук па спецыяльнасці «літаратура народаў краін замежжа (польская)».

У 2019 г. скончыла аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, абараніла кандыдацкую дысертацыю, атрымала ступень кандыдата філалагічных навук.

2013–2018 гг. – настаўнік польскай мовы, беларускай мовы і літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, выкладчык польскай мовы на курсах замежных моў.

З 2019 г. па цяперашні час – дацэнт кафедры германскіх моў ФМА БДУ. Мае больш за 30 навуковых публікацый, у тым ліку і за мяжой.

Ганаравана стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за 2019 год. Уключана ў банк даных адоранай моладзі РБ.



**Круглова Надзея Валянцінаўна** – кандыдат псіхалагічных навук (дачка Кругловай Г. А. і Буко В. П.).

Круглова Надзея Валянцінаўна нарадзілася 02.06.1995 года ў Мінску.

У 2017 г. з адзнакай скончыла факультэта сацыякультурных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «сацыяльная праца, сацыяльна-педагагічная дзейнасць».

У 2019 г. атрымала ступень магістра псіхалагічных навук па спецыяльнасці «псіхалогія».

У 2019 г. скончыла перападрыхтоўку на ўзроўні вышэйшай адукацыі ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі пры ўстанове адукацыі Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка з прысваеннем кваліфікацыі «Настаўнік-лагапед» па спецыяльнасці «лагапедыя».

У 2023 г. скончыла аспірантуру і атрымала дыплом даследчыка ў галіне псіхалагічных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «сацыяльная псіхалогія». У сакавіку 2024 года абараніла кандыдацкую дысертацыю, у чэрвені 2024 прысвоена ступень кандыдата псіхалагічных навук.

Мае больш за 20 навуковых публікацый, у тым ліку за мяжой.

З 2014 г. па 2021 г. працавала педагогам дадатковай адукацыі ў ДУА «Яслі-сад №553», «Яслі-сад №500», «Яслі-сад №147».

Са снежня 2024 года і па цяперашні час – старшы выкладчык кафедры псіхалогіі, зместу і метадаў выхавання ДУА «Акадэмія адукацыі».

Грамата за добрасумленную працу ў сферы выхавання падрастаючага пакалення ДАЛ імя М. Гастэлы (2016). Падзякі за добраахвотніцкую дзейнасць БДУ (2014–2016). Дыплом лаўрэата II ступені (2015) на конкурсе «Найлепшы маладзевы праект – 2014» пры Беларускім дзяржаўным універсітэце з праектам «Студэнцкая грамадская добраахвотніцкая дзейнасць». Дыплом фіналіста конкурсу (2015) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на атрыманне гранта на рэалізацыю студэнцкага праекта з праектам «Крэатыў-маркет».

Дынастыя Кругловых зрабіла вялікі ўнёсак у развіццё Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэта прыклад працавітасці і высокага прафесіяналізму.

## НАВІНЫ МІНСКА І БЕЛАРУСІ

На пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў назначылі выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на 26 студзеня 2025 года.

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі прадставілі выставу работ навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага каледжа рамесніцтва і дызайну імя М. А. Кедышкі «Рэха вайны: галасы пакаленняў».

Рачны трымаран спушчаны на ваду ў Свіслачы. У кастрычніку-лістападзе 2024 года рачны трамвайчык будзе выкарыстоўвацца ў тэставым рэжыме, а паўнацэнна функцыянаваць ён пачне ў вясенне-летні перыяд 2025 года.

# АДДАНАСЦЬ УНІВЕРСІТЭТУ. ДЫНАСТЫЯ КАЗАКОВЫХ: 136 ГАДОЎ З БДУ

**Дынастыю Казаковых складаюць кандыдаты навук, дацэнты, загадчыкі кафедраў, старшыя выкладчыкі кафедраў, аўтары манаграфій і шэрагу навуковых публікацый. Педагагічны стаж дынастыі Казаковых у БДУ складае 136 гадоў.**

**Казакоў Юрый Леанідавіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Педагагічны стаж у БДУ – 46 гадоў.

Нарадзіўся 27 ліпеня 1950 г. у мястэчку Шуміліна Віцебскай вобласці ў сям'і былога франтавіка і партызана Вялікай Айчыннай вайны. Род Казаковых вядзе свой пачатак з XIII ст. Асабліва Юрый Леанідавіч вылучае свайго прадзеда – Казакова Навума Фёдаравіча (1828–1932), які быў удзельнікам руска-турэцкай вайны 1877–1878 гг. Навум Фёдаравіч быў цяжка паранены на фронце, аднак змог аднавіцца і пасля вяртання стварыў вялікую моцную сям'ю. Яго старэйшая дачка Фёкла нарадзіла 16 дзяцей. А сын Пётр, дзядуля Юрыя Леанідавіча, быў удзельнікам Першай сусветнай вайны.

У 1967 г. Юрый Леанідавіч скончыў сярэднюю школу №2 г. Мінска і паступіў на гістарычны факультэт БДУ. З падзякай успамінае сваіх выкладчыкаў: М. П. Палеціку, У. М. Сікорскага, І. В. Царук, Э. М. Загарульскага і іншых. Першым навуковым кіраўніком стала Іраіда Восіпаўна Царук.

Падчас вучобы актыўна займаўся грамадскай працай, узначальваў шэфскі сектар камітэта камсамола БДУ.

Юрый Леанідавіч скончыў гістарычны факультэт у 1972 г. і паступіў у аспірантуру на кафедру гісторыі КПСС. У гэтым жа годзе стаў кандыдатам у члены КПСС, у 1973 г. – членам партыі. Пасля заканчэння аспірантуры ў 1975 г. быў залічаны выкладчыкам на кафедру. У 1978 г. абараніў дысертацыю і стаў старшым выкладчыкам кафедры. У 1982 г. Юрыю Леанідавічу было прысвоена званне дацэнта. У гэтым жа годзе быў абраны сакратаром партыйнай арганізацыі факультэта гістарычнага факультэта. На дадзенай пасадзе працаваў да 1984 г. З 1992 па 1994 гг. Юрый Леанідавіч працаваў на кафедры гісторыі Беларусі. У 1994 г. стаў працаваць на кафедры старажытнай і сярэднявечнай гісторыі Беларусі. З 1997 па 2007 г. з'яўляўся намеснікам дэкана гістарычнага факультэта. З 1997 па 2000 гг. – загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага свету і сярэдніх вякоў. Гэту ж пасаду займаў з 2006 па 2016 гг. З 1988 па 2016 быў адказным сакратаром рэдкалегіі часопіса «Веснік БДУ. Серыя 3. Гісторыя, права, эканоміка». Аўтар звыш 150 навуковых публікацый, дзвюх калектыўных манаграфій. Навуковы кіраўнік шасці аспірантаў.

У 1970 г. быў узнагароджаны граматай ЦК КПСС, у 2000 г. – нагрудным знакам Міністэрства адукацыі «Выдатнік адукацыі», у 2010 г. стаў заслужаным работнікам БДУ, у 2021 г. узнагароджаны нагрудным знакам «100 гадоў БДУ».

Юрый Леанідавіч адзначае: «Аналіз гістарычных падзей дазваляе чалавеку асэнсаваць сваё месца ў сусвеце, вызначыць перспектыву развіцця грамадства. Нам патрэбныя маладыя, энергічныя паслядоўнікі, якія добра валодаюць сучаснымі тэхналогіямі, бо пэўныя пытанні гістарычнага развіцця грамадства патрабуюць глыбокага і ўсебаковага разгляду».

**Казакова Таццяна Леанідаўна** (сястра Казакова Ю. Л.) – старшы выкладчык кафедры эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі. Педагагічны стаж у БДУ – 43 гады.



*Кафедра гісторыі новага і найноўшага часу, 2019 г. Казакоў Л. Ю. крайні справа*

Нарадзілася ў 1956 г., з 1973 г. па 1978 г. навучалася на геаграфічным факультэце БДУ. З 1979 г. працавала ў сацыялагічнай лабараторыі БДУ навуковым супрацоўнікам. З 1983 г. па 2015 г. была выкладчыкам, старшым выкладчыкам кафедры эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі Беларусі на геаграфічным факультэце БДУ. Пасля гэтага (2015–2022 гг.) была старшым навуковым супрацоўнікам у цэнтры сацыяльных і палітычных даследаванняў БДУ. З'яўляецца аўтарам звыш 80 навуковых публікацый, у тым ліку 6 калектыўных манаграфій.

**Казакова Таццяна Пятроўна** (жонка Казакова Ю. Л.) – кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Педагагічны стаж у БДУ – 32 гады.

Нарадзілася 5 сакавіка 1958 г., выхоўвалася ў сям'і настаўнікаў. У 1975 г. з залатым медалём скончыла Клімавіцкую сярэднюю школу №2. У 1980 г. з адзнакай скончыла філалагічны факультэт БДУ. З 1980 па 1985 г. была абрана сакратаром камітэта камсамола філалагічнага факультэта БДУ. У 1988 г. скончыла аспірантуру БДУ. Пачала выкладчыцкую дзейнасць на філалагічным факультэце з 1986 г. У 1991 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю «Беларуская літаратура XV ст. і старажытнаруская пісьменнасць (летапісанне, прамоўніцкая проза)». Навуковым кіраўніком была дацэнт Л. Л. Кароткая. Т. П. Казакова з'яўляецца аўтарам 115 навуковых публікацый. У 2008 г. апублікавала манаграфію «Грыгорый Цамблак: царкоўны дзеяч і пісьменнік».

З 2007 па 2018 гг. з'яўлялася загадчыцай кафедры гісторыі беларускай літаратуры. Праводзіла мноства мерапрыемстваў, канферэнцый, сустрэч з паэтамі і пісьменнікамі. Стала арганізатарам V Міжнародных Скарынаўскіх навуковых чытанняў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У 2011 г. кафедра арганізавала і правяла Міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Роля асветнікаў у Беларусі і Турцыі», XI Міжнародную навуковую канферэнцыю «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай» (2013 г.). На кафедры быў створаны паэтычны гурток «Альтанка». Асаблівай папулярнасцю карысталіся беларускія вечары, прысвечаныя вядомым паэтам і пісьменнікам. Неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі БДУ і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, у 2016 г. стала лаўрэатам конкурсу «Жанчына года БДУ» ў намінацыі «Кіраўнічая праца».

**Казакоў Леанід Юр'евіч** – старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу (сын Казаковых Ю. Л. і Т. П.). Педагагічны стаж у БДУ – 15 гадоў.

Нарадзіўся 4 кастрычніка 1983 г. Выхоўваўся ў атмасферы павагі да мінулага, любіў слухаць аповеды пра сваіх продкаў, якія мужна змагаліся з фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Дзядуля па бацьку Казакоў Леанід Пятровіч быў камісарам партызанскай брыгады імя Леніна. Дзядуля па маці Сотчанка Пётр Міхайлавіч ваяваў на Ленінградскім фронце ў танкавым батальёне. Прадзед Кандраценка Андрэй Сцяпанавіч падчас Вялікай Айчыннай вайны дайшоў да Берліна і распісаўся на Рэйхстагу.

Пасля 9 класаў паступіў у Ліцэй БДУ, дзе браў удзел у алімпіядах па гісторыі. У 2001 атрымаў дыплом І ступені на Рэспубліканскай алімпіядзе па гісторыі. З 2001 г. па 2006 г. быў студэнтам гістарычнага факультэта БДУ. Тады зацікавіўся гісторыяй Беларусі XVI–XVII стст. Вялікі ўплыў на яго станаўленне аказалі П. А. Лойка, А. Г. Каханоўскі, А. А. Егарэйчанка, А. А. Яноўскі, С. М. Ходзін і іншыя. Падчас навучання на гістарычным факультэце займаўся гістарычнай рэканструкцыяй ВКЛ XIV–XV стст., удзельнічаў у рыцарскіх турнірах.

З 2006 па 2009 навучаўся ў аспірантуры. З 2009 г. па 2015 г. працаваў на кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу. З 2015 па цяперашні час працуе там жа на пасадзе старшага выкладчыка. З'яўляецца аўтарам шматлікіх навуковых публікацый, удзельнікам навуковых канферэнцый. Браў удзел у выданні іўеўскага «Буквара» 1618 г. у трох тамах. Пераклаў на беларускую мову гімн студэнтаў Gaudeamus.

З'яўляецца вядучым фэстаў гістарычнай рэканструкцыі «Менск старажытны», «Наш Грунвальд», «Нясвіжская фартэцыя», «Легендарныя эпохі» і інш. Любіць рок-музыку, піша песні, іграе на бас-гітары.

На дадзены момант завяршае працу над кандыдацкай дысертацыяй па сацыяльна-эканамічнай праблематыцы на беларускіх землях у XVI–XVII стст. Працуе са студэнтамі на розных факультэтах БДУ.

Дзейнасць сям'і Казаковых сведчыць пра любоў і адданасць роднай alma mater. На ўсіх узроўнях яны ўдасканальваюць і развіваюць найлепшыя традыцыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.


*Кафедра гісторыі Беларусі старажытнага свету і сярэдніх вякоў. Казакоў Ю. Л. другі справа*

**Дар'я АРТАМОНАВА**

УНІВЕРСІТЭТ
29 кастрычніка 2024 года, № 10 (2288)

# КАЗКА НА «КУБКУ ПЕРШАКУРСНІКА – 2024»



Штогод БРСМ высвятляе ў першакурснікаў, які факультэт самы разумны, хуткі і крэатыўны. У суботу 5 кастрычніка за кубак змагаліся 15 каманд.

Тэмай конкурсу і творчых выступленняў сталі казкі і міфы. У тую раніцу на пляцоўцы аграгарадка Шчомысліца чулі музыку, крычалкі і нават бой барабанаў. На адной паляне сустракаліся персанажы з самых розных казак і мультфільмаў.

Да сваіх ідэй студэнты падышлі крэатыўна і з гумарам. Перш за ўсё яны прадставілі сваю каманду і факультэт з дапамогай творчых візітовак. Журы ў складзе кіраўніцтва і супрацоўнікаў БДУ і БРСМ ацэньвала песні, танцы і тэатральныя сцэнкі.

Галоўнай спартыўнай падзеяй мерапрыемства стала праходжанне турыстычнай сцяжыны. Перад гэтым хлопцам і дзяўчатам нагадалі правілы бяспекі і правялі інструктаж аховы правапарадку.

Адзін за адным каманды прайшлі дзевяць пікетаў, на якіх правяралі свае спартыўныя навыкі, спрыт, каардынацыю, кемлівасць, а таксама ўменне працаваць у камандзе, давяраць адзін аднаму і правільна размяркоўваць абавязкі. Першакурснікі адгадвалі песні на «Залатым грамафоне», праходзілі паласу перашкод, збіралі пазлы з завязанымі вачыма, успаміналі факты пра БРСМ і іншае. Можна было набраць дадатковыя балы, здзівіўшы арганізатара, які адказваў за пікет, або атрымаць іх на дадатковых конкурсах пасля турсцяжыны.

– *Кожны год факультэты збіраюцца разам, першакурснікі знаёмяцца, выязджаюць на прыроду, пачынаюць размаўляць не толькі ў сценах універсітэта, але і ў нефармальных сітуацыях. Усе візітоўкі, камандныя крычалкі, выступленні даюць эмоцыі, якія варта чакаць цэлы год,* – дзеліцца другакурсніца філалагічнага факультэта і кіраўніца валанцёрскага кірунку БРСМ БДУ Кацярына Буневіч.

Дзяўчына з’яўляецца арганізатарам многіх мерапрыемстваў, але «Кубак першакурсніка» і зараз застаецца адным з яе любімых. На думку студэнткі, самае галоўнае, што дае студэнтам акцыя – гэта знаёмствы. Бо міжфакультэцкія зносіны вельмі важныя, але, калі студэнт толькі прыходзіць у БДУ, яму можа быць складана сустрэцца з тымі, хто вучыцца ў іншых карпусах.




Завяршыўся конкурс троххвіліннымі творчымі выступленнямі, на якіх камандам трэба было незвычайна рэалізаваць сваю казку. Пераможцам стала каманда «Калабарыкі» юрыдычнага факультэта.

– *Усе былі яркімі, гучнымі і адпавядалі тэматыцы. Мы падтрымлівалі іншыя факультэты, а таксама добра паказалі сябе. Другое заданне было не з простых, але турпаласа пакінула шмат пазітыўных уражанняў. Мы выпрабавалі сябе ў спрыце, шпаркасці, крэатыўна падыходзілі да заданняў, і галоўнае – зрабілі гэта максімальна хутка,* – распавядае ўдзельніца каманды Ульяна Каліева.

На трэцім заданні пераможцы паказалі гумарыстычную сцэнку пра калабка, які раней «меў адміністрацыйныя правапарушэнні», але стаў на шлях выпраўлення. Іх нумар скончыўся запальным танцам і падтрымкай іншых каманд.

Рэпеціраваць першакурснікі пачалі за тыдзень да мерапрыемства. Пра падрыхтоўку нумароў распавёў удзельнік каманды Усевалад Гомза:

– *Над канцэптам каманды мы думалі сумесна, але кожны ўносіў свае ідэі, якія ў выніку мы сабралі ў адзіны механізм. Безумоўна, на шляху ўзнікалі цяжкасці, бо не кожны ўдзельнік каманды мог знайсці час на штодзённыя рэпетыцыі. Але ў выніку мы вельмі хутка згуртаваліся і занялі запаветнае першае месца,* – дадае Усевалад.

Студэнты прызнаюцца, што не справіліся б без падтрымкі і дапамогі куратараў каманд.

– *На маёй памяці ўпершыню ў нас была настолькі самастойная і дружная каманда на «Кубку першакурсніка». Студэнты скарылі нас сваёй суладнай, арганізаванай і карпатлівай працай. Яны вельмі сур’ёзна паставіліся да задачы, а падрыхтоўка праходзіла максімальна прыемна, па-сяброўску камфортнай. Было прапанавана шмат творчых ідэй, якія мы ўсе імкнуліся дадаць у канчатковы сцэнарый. Малайцы!* – дзеліцца ўражаннямі куратар каманды Лізавета Чамаданава.

Другое месца заняў філалагічны факультэт «Простафілфакіна», трэцяе – «Таямніца залатога ключыка» юрыдычнага каледжа.

ФГГ атрымаў у сваю скарбонку дзве перамогі: у катэгорыях «Найлепшая група падтрымкі» і «Найлепшая мужчынская роля» за выступленне першакурсніка Данііла Даржынкевіча. Прыз глядацкіх анлайн-сімпатый прысудзілі камандзе «Зялёная прэса» факультэта журналістыкі. «Самай спартыўнай камандай» названы ваенны факультэт, а прыз у намінацыі «Найлепшая жаночая роля» атрымала першакурсніца механіка-матэматычнага факультэта Ульяна Пінчук.

Напрыканцы мерапрыемства ўсіх удзельнікаў пачаставалі палявым абедам і гарбатай.

**Ганна КАЗАКОВА**

# «РУХАЙСЯ НАПЕРАД, ТАДЫ І АТРЫМАЕШ ВЫНІК»

*У лік пераможцаў верасьнёўскага Адкрытага чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па мастацкай гімнастыцы ўвайшла трэцякурсніца факультэта філасофіі і сацыяльных навук Дар'я Ткачова. Тытул чэмпіёна краіны – важнае дасягненне яе насычанай кар'еры.*



Спартыўная гісторыя Дар'і пачалася з пяці гадоў. Яе мама шукала гурток для энергічнай дачкі і, паслухаўшы рэкамендацыі знаёмых, звярнулася да трэнера па гімнастыцы. Спорт з'яўляецца традыцыяй іх сям'і: мама займаецца пілатэсам і ёгай; айчым – майстар спорту і дагэтуль падтрымлівае форму. Дзядуля быў прафесійным баксёрам і атрымаў званне чэмпіёна СССР сярод юнакоў.

– Тады я нават не падазравала аб існаванні мастацкай гімнастыкі. У залу прыйшла выключна з ініцыятывы маці. Але ўражанні аказаліся вельмі добрымі, таму працягнула хадзіць на заняткі. Усе мае наступныя рашэнні, звязаныя са спортам, прымала выключна сама, – дзеліцца дзяўчына.

Першы трэнер Дар'і Ткачовай, Вольга Хроль (на сёння – трэнер-выкладчык Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі), займалася з дзяўчынкай да шостага класа. Пасля перад Дар'яй паўстаў выбар: альбо засяродзіцца на вучобе ў гімназіі, альбо пераходзіць у прафесійны спорт. Параіўшыся з Вольгай, яна перайшла ў Рэспубліканскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву. Яе таварышамі былі спартсмены розных напрамкаў, таму расклад заняткаў быў падстроены пад трэніроўкі, дазваляючы вучням максімальна засяродзіцца на спартыўных дасягненнях.

## ПАСТУПОВЫ ПРАГРЭС

Другім трэнерам Дар'і стала Марына Лобач, уладальніца залатога медаля Алімпіяды – 1988 і звання першай алімпійскай чэмпіёнкі ў СССР па мастацкай гімнастыцы.

На першыя спаборніцтвы, у якіх удзельнічала Дар'я Ткачова, яна цяпер глядзіць па-іншаму. Ніякіх сур'ёзных ставак тады не было, і перспектывы неспрактыкаваных спартсменаў выглядалі дастаткова туманнымі. Затое медалі, атрыманыя на тых конкурсах, служылі матывацыяй для руху наперад. Дзяўчына расла, упарта трэніравалася, і разам з ёй мяняўся і ўзровень спаборніцтваў. Сапраўды знакавай стала перамога на 17-м Міжнародным турніры на прызы Марыны Лобач, дзе Дар'я атрымала галоўную ўзнагароду – імянную статуэтку алімпійскай чэмпіёнкі.

З часам колькасць узнагарод гераіні расла, аднак давялося і цяжкасцяў, звязаных са спартыўнымі санкцыямі. Выступленні беларускіх спартсменаў былі абмежаваны турнірамі блізкага замежжа. Тым не менш Дар'я дэманстравала сваё майстэрства: напрыклад, на турніры Friendship International у сталіцы Арменіі Ерэване дзяўчына заваявала сярэбраны медаль. А сёлета Дар'я нарэшце вярнулася на міжнародную арэну.



– Многія краіны палепшылі свае пазіцыі – іх гімнасткі аказаліся сур'ёзнымі саперніцамі, з якімі ты змагаешся ўжо не за цэлыя балы, а за дзясятыя і сотыя долі, бо і яны здольныя паўплываць на вынік, – адзначыла спартсменка. – Самыя яркія эмоцыі былі на спаборніцтве ў Партугаліі, калі я выйграла золата ў фіналах з мячом.

Але самым значным трафеем года, безумоўна, для Дар'і з'яўляецца залаты медаль у практыкаваннях з абручом Адкрытага чэмпіянату Беларусі па мастацкай гімнастыцы. Для маладых спартсменаў гэты чэмпіянат – адзін з ключавых стартаў сезона, бо па яго выніках будуць размяркоўвацца месцы ў нацыянальнай зборнай і праводзіцца далейшы адбор на міжнародныя турніры.

– Любыя спаборніцтвы патрабуюць ад цябе поўнай аддачы, тым больш такога маштабу. Досыць моцна стамлялася, як фізічна, так і маральна. Але намагалася сябе апраўдваюць. Вельмі дапамагло тое, што выступалі ў сябе дома. Знаходзіцца ў роднай зале, сярод сваіх трэнераў, чуць гучную падтрымку нашых гледачоў – гэта матывуе выкладвацца на максімум. Цяпер, атрымаўшы тытул, не збіраюся спачываць на лаўрах. Сышла з пастамента, і ўсё, больш не чэмпіён; калі не працягнеш працаваць на поўную сілу, не паб'еш свае ж рэкорды, супернікі цябе хутка абыдуць.

## ІНШЫЯ НАПРАМКІ

Зараз усе мэты спартсменкі пабудаваны вакол мастацкай гімнастыкі, аднак гэта не адзіная цікавая ёй сфера. У дзяцінстве Дар'і падабалася маляваць, чытаць кнігі, танцаваць і прыдумляць свае арыгінальныя гімнастычныя рухі. Цяпер жа дзяўчына аддае перавагу адпачынку з сям'ёй і сябрамі, сумеснаму наведванню тэатраў, выставак і канцэртаў, а таксама вандроўкам па славутасцях Беларусі. Яна таксама з задавальненнем назірае за іншымі відамі спорту: плаваннем, лёгкай атлетыкай, сноўбордынгам, нават за «Формулай-1». І, вядома ж, старанна вучыцца на факультэце філасофіі і сацыяльных навук БДУ.

– Адаптавацца да вучобы было цяжка. Універсітэт моцна адрозніваецца ад школы, тым больш ад спартыўнай, дзе ва ўсіх адзіная матывацыя і дысцыпліна. Акрамя таго, свет звычайнага чалавека і свет спартсмена абсалютна розныя. Так што знаходзіць агульныя тэмы з аднакурснікамі, праводзіць час у кампаніях атрымлівалася слаба. Але зараз, пасля чатырох семестраў, магу сказаць, што ўлілася ў новае жыццё. Сумяшчаць вучобу і спорт нялёгка, але я стараюся. Даводзіцца самастойна асвойваць некаторыя навучальныя прадметы.

Дар'я ўпэўнена, што пасля выпуску будзе працаваць выключна па спецыяльнасці. Яна хоча набрацца вопыту ў працы па-за спортам, а з адукацыяй і набытымі ведамі гэта будзе зрабіць значна прасцей.

## ПЕРАМОЖНЫ НАСТРОЙ

Жыццё спартсмена вызначаюць два фактары: бесперапынныя трэніроўкі і дысцыпліна. Дар'я практычна кожны дзень трэніруецца па 7-8 гадзін, дазваляючы сабе толькі адзін выхадны. Яна таксама прытрымліваецца строгага рэжыму сну і спартыўнага харчавання, каб арганізм паспяваў аднаўляцца паміж спаборніцтвамі. Некаторымі рэчамі даводзіцца ахвяраваць: напрыклад, застаецца мала часу на сяброў. Аднак Дар'я захоўвае пазітыўны настрой.

– Перажытыя выпрабаванні навучылі мяне тром важным урокам. Па-першае, што пра цябе ні казалі б, нельга спыняцца. Рухайся наперад, рабі ўсё сумленна, без хлусні, без ляноты, тады і атрымаеш вынік. Па-другое, нават дрэнны досвед – гэта ўсё ж такі досвед, які дапамагае выправіць допушчаныя памылкі. Нарэшце, па-трэцяе, трэба шукаць светлыя моманты нават у самыя пахмурныя дні, знаходзіць задавальненне ў дробязях, перамагаць унутраную нуду. Сёння ў цябе можа не быць жадання працаваць, і ты прапусціш практыкаванне. А паслязаўтра ўжо будзеш дакараць сябе за тое, што да медаля не хапіла літаральна долі бала.

Я знаходжу матывацыю ў здабытых перамогах, у кар'ерным росце, у падтрымцы гледачоў і, вядома, у любові да сваёй справы. І таму я працягваю ісці да пастаўленых мэт нягледзячы ні на што.

**Дзям'ян КУЛІКОВІЧ**

УНІВЕРСІТЭТ
29 кастрычніка 2024 года, № 10 (2288)

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'яўляе конкурс

## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 7 гадоў |
| | [2] На пасаду загадчыка кафедры прызначаецца асоба, якая мае вышэйшую адукацыя, навуковую ступень доктара ці кандыдата навук, навуковыя працы, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў |
| **Прафесар** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, ці навуковае званне прафесара, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў |
| | [3] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў |
| **Старшы выкладчык** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў не менш за 3 гады, ці вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорый «Кіраўнік» ці «Спецыяліст», праца якіх адпавядае напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў |
| **Асістэнт** | Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 год |

**Хімічны факультэт БДУ аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій | 1 год |
| Загадчык кафедры арганічнай хіміі | 1 год |
| Загадчык кафедры фізічнай хіміі і электрахіміі | 1 год |
| Загадчык кафедры высокамалекулярных злучэнняў | 1 год |
| Прафесар кафедры аналітычнай хіміі | 2 гады |
| Прафесар кафедры высокамалекулярных злучэнняў | 1 год |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі | 1 год |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі | 1 год |
| Дацэнт кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры аналітычнай хіміі | - |
| Асістэнт кафедры неарганічнай хіміі | - |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203, да 27 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203, да 27 снежня.

### НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА «ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ» БДУ

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:**

**Загадчыка лабараторыі радыёгалаграфіі**
па спецыяльнасці 01.04.04 «фізічная электроніка» – 1 адзінка;

**Галоўнага навуковага супрацоўніка лабараторыі фізіка-хіміі палімерных матэрыялаў і прыродных арганічных злучэнняў**
па спецыяльнасці 05.11.07 «аптычныя і оптыка-электронныя прыборы і комплексы» – 1 адзінка.

Месца (адрас) прыёму заяў для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, каб. 230.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, каб. 230. Тэрмін конкурсу – месяц з дня апублікавання.

**Факультэт філасофіі і сацыяльных навук аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры сацыяльнай і арганізацыйнай псіхалогіі [2] | 3 гады |
| Загадчык кафедры сацыяльнай працы і рэабілітАлогіі [2] | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 27 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 528; да 27 снежня.

**Фізічны факультэт аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі | 1 год |
| Прафесар кафедры фізікі цвёрдага цела і нанатэхналогій [3] | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры фізічнай оптыкі і прыкладной інфарматыкі [3] | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315; да 27 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г, Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326; да 27 снежня.

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры багаслоўя | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 24, каб. 302; да 27 лістапада.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 24, каб. 301; да 27 снежня.

[1] (дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

# ДАКРАНУЛІСЯ ДА МАЛАНКІ І АДЧУЛІ ВАДКІ АЗОТ. ЯК ПРАЙШОЎ «ДЗЕНЬ НАВУКОВАЙ МОЛАДЗІ» СА СТУДЭНТАМІ ФІЗФАКА БДУ?

*На пляцоўцы Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта больш за 1000 чалавек наведалі навукова-папулярныя лекцыі, трэнінгі і квізы падчас фестывалю **«Дзень навуковай моладзі»**. З усіх рэгіёнаў Беларусі прыехалі матываваныя школьнікі і навуковыя эксперты, у іх ліку і студэнты фізічнага факультэта БДУ. Пра «КРЫЯ-шоу», доследы з электрычнасцю і эксперыментальную фізіку даведаліся ва ўдзельнікаў праекта – студэнтак 3 курса Варвары Суравец і Яны Розум і студэнта 6 курса Дзмітрыя Косіка.*

Фестываль накіраваны на ўзмацненне значнасці навукі, а таксама на прыцягненне ўвагі да дасягненняў беларускіх даследчыкаў. Ён папулярызуе навуку сярод школьнікаў і студэнтаў і дае моладзі магчымасць развіць свае навыкі ў гэтай сферы. Нагадаем, што напярэдадні мерапрыемства прайшло пасяджэнне савета маладых навукоўцаў пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, на якім абмяркоўваліся пытанні ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўніверсітэтах, была разгледжана рэалізацыя Рэспубліканскага моладзевага інавацыйнага праекта «100 ідэй для Беларусі» і запланавана школа маладога навукоўца на 2024 год.

Удзельнікі фестывалю наведалі інтэрактыўныя зоны і віктарыны, а таксама выставу навуковых дасягненняў маладых навукоўцаў з ВНУ. Сярод экспанатаў былі прадстаўлены вучэбная лабараторыя аэракасмічных вымярэнняў, новыя цвёрдыя кампазіцыйныя рэагенты для ачысткі вады, тэхналогіі стварэння ядомых плёнак для ўпакоўкі прадуктаў, метады трансмуказальнай дастаўкі актыўных інгрэдыентаў, арганамінеральныя ўгнаенні і інш. Праграму дапоўніла серыя майстар-класаў, у рамках якіх студэнты фізічнага факультэта БДУ правялі «КРЫЯ-шоу», а прадстаўнікі юрыдычнага факультэта прадэманстравалі тэхналогію зняцця адбіткаў пальцаў.

Пад кіраўніцтвам намесніка дэкана фізічнага факультэта Мікалая Гарбачука група з 12 студэнтаў прадставіла такія эксперыменты, як токі Фуко, ваўчкі Томпсана, картэзіянскі вадалаз, катушка Тэслы, званочак Франкліна, тлумачэнне якіх не толькі інфармавала, але і забаўляла гледачоў. Кожны дослед быў прадуманы да дробязяў, а відовішча прыцягвала ўвагу.

Механічныя дэманстрацыі ваўчкоў Томпсана і картэзіянскага вадалаза заглыбілі ўдзельнікаў у свет кінетыкі і дынамікі. Картэзіянскі вадалаз адлюстроўвае закон Архімеда. Пры ўздзеянні на бутэльку ціск унутры ёмістасці павялічваўся, робячы вагу прадмета большай і прымушаючы яго апускацца на дно.

– Гэтак жа наш студэнт сабраў дэтэктар зараду і паказаў эксперыменты з токамі Фуко: мы кідалі магніт у алюмініевую трубку, клалі ў руку чалавеку блок з алюмінію і вадзілі над ім неадымавым магнітам, – распавядае Варвара.

Электрычныя эксперыменты паказалі, як статычная электрычнасць і магнітныя палі ўплываюць на электрычныя токі. Асаблівую ўвагу тых, хто прыйшоў, прыцягнула катушка Тэслы. Яна стварала чароўнае відовішча з электрычнымі разрадамі, да якіх гледачы спрабавалі дакрануцца, бо яны падобныя да маланкі. Трэба было выкарыстоўваць ахоўныя пальчаткі.

## КАТУШКА ТЭСЛЫ – ШТО ГЭТА?

– Гэта цудоўная прылада, з якой можна адчуць сябе ўладаром маланак. Яна стварае вакол высокае напружанне, якое дасягае дзясяткаў тысяч вольт. Такое напружанне амаль нідзе не сустрэнеш, таму з'явы, якія можна ўбачыць у такім магутным полі, зачароўваюць. Мы можам прапусціць такое вялікае напружанне праз сябе, і нічога не адбудзецца, калі вытрымліваць тэхніку бяспекі. Таксама там знаходзяцца розныя газы, у асноўным высакародныя. Яны пачынаюць ствараць свячэнне розных колераў. І такое даступна не толькі газам, але і розным лямпачкам, якія ёсць у кожным пакоі, – тлумачыць Дзмітрый.

## МАЛАНКА З КАТУШКІ ІДЭНТЫЧНАЯ ЗВЫКЛАЙ НАМ НАВАЛЬНІЧНАЙ?

– Не зусім такая, як сапраўдная маланка, хіба што візуальна маленькая версія, а так яна слабейшая. Інакш мы не давалі б людзям з ёй узаемадзейнічаць, – падкрэслівае Варвара. Напрыканцы працы з катушкай з дапамогай разраду ад шпіля студэнтка запальвала каляровыя бенгальскія агні.

## З ЯКІМІ ПРАДМЕТАМІ ЎЗАЕМАДЗЕЙНІЧАЎ АЗОТ У ЭКСПЕРЫМЕНТАХ?

– Мы паказалі ўзаемадзеянне з арганічнымі і неарганічнымі прадметамі. Напрыклад, калі пагрузіць ружу ў вадкі азот на 15 секунд, а пасля дастаць і стукнуць яе аб стол або аб чалавека, яна разляціцца на кавалкі, як шкло. Тое самае адбывалася і з гумовым шарыкам, а пры ўзаемадзеянні з кіпенем у нас атрымалася невялікая вытворчасць аблачынак, – патлумачыў Дзмітрый. Гэты запамінальны дослед стаў адным з самых яркіх момантаў у праграме. Фестываль не толькі натхніў удзельнікаў, але і паказаў, як навука можа ўразіць.

– Я задаволена, бо мне падабаецца фізіка. Выступаць з эксперыментамі цікава дзеля рэакцыі людзей: здзіўлення і захаплення. Прыемна дзяліцца тым, што натхняе цябе самога, а таксама ўсведамляць, што хтосьці з нашых юных гледачоў можа знайсці сябе ў фізіцы, зацікавіцца, як паказваюцца эксперыменты» – падзялілася Варвара.

– Фестываль спадабаўся, ветлівы калектыў, шмат актыўнасцяў. Некаторыя ўдзельнікі цікавіліся, іх было няшмат, але я ўпэўнены, што астатнія проста саромеліся. У асноўным пыталіся, адкуль мы, калі прыедзем яшчэ, – адзначыў Дзмітрый.

**Кацярына АРЦЮХОЎСКАЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 29.10.2024 г.
Зак. 976. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*